**А. А. Гужалоўскі,**
*доктар гістарычных навук, прафессар,*
*прафессар кафедры культуралогіі*
*і псіхолага-педагагічных дысцыплін*
*ІПКіПК*

# АКТУАЛЬНЫЯ КІРУНКІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ МУЗЕЙНАЙ АСАЦЫЯЦЫІ ЯК ЦЭНТРА НЕФАРМАЛЬНАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ ПРЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАГРАМ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ У ІПКіПК

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сувязі з кардынальнымі зменамі, што адбываюцца ў музейнай сферы, пытанні нефармальнай адукацыі працуючых у ёй спецыялістаў становяцца ўсё больш актуальнымі. Поспех новых музейных праектаў у значнай меры вызначаецца ўзроўнем прафесійна-асобаснага развіцця, які, у сваю чаргу, вызначаецца актыўна-творчай, ствральнай пазіцыяй музейнага работніка, яго здольнасцю стаць ініцыятарам новаўвядзенняў у сваёй установе, актыўным удзельнікам сумеснай калектыўнай дзейнасці па развіцці інавацый у музейнай сферы. Вынікі музейна-праектнай дзейнасці напрамую залежаць ад прафесіяналізму і агульнай культуры спецыялістаў у галіне матэрыяльнай культуры, куратараў, музейных педагогаў. Таму музейная сфера Беларусі мае вострую патрэбу ў сучасных спецыялістах, здольных якасна вырашаць задачы захавання і інтэрпрэтацыі прыроднай і культурнай спадчыны ў новых умовах.

Як вядома, працэс фарміравання прафесійных якасцей і развіцця здольнасцей асобы павінен адбывацца на працягу ўсяго жыцця. Гэта прадугледжвае пастаяннае абнаўленне і ўдасканаленне навыкаў, у тым ліку ў працэсе павышэння кваліфікацыі. Кожны музейны работнік сёння мае права выбраць для сябе мадэль павышэння кваліфікацыі ў адпаведнасці са сваімі патрэбамі і індывідуальнымі асаблівасцямі [1, с. 75]. Значная частка музейных работнікаў аддае перавагу традыцыйнай, эфектыўнай форме: навучанню ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўцы кадраў БДУКМ.

Існуючая зараз у Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі сістэма паспяхова вырашае наступныя задачы: актуалізаваць асабістыя якасці музейнага супрацоўніка, узняць

на новы ўзровень яго прафесійнае майстэрства. Але ў працэсе бесперапыннай адукацыі музейны работнік можа не толькі атрымліваюць навыкі, неабходныя яму для адаптацыі ў прафесійным асяроддзі, але таксама змяняць гэтае асяроддзе, уплываць на культурную сітуацыю з мэтай рэалізацыі сваіх асобасных, прафесійных якасцяў, творчага патэнцыялу, на практыцы рэалізоўваць сваю суб’ектнасць.

Гэтаму спрыяюць нефармальныя мадэлі павышэння кваліфікацыі, якія робяцца ўсё больш запатрабаванымі ў апошні час. Нефармальнае павышэнне кваліфікацыі ад традыцыйнага адрозніваецца тым, што яно не вядзе да абавязковай сертыфікацыі. Аднак яно здольна задаволіць патрэбнасць музейнага супрацоўніка ў самаадукацыі, пашырыць яго агульны культурны ўзровень і кругагляд. Акрамя таго, акцэнтаванне ўвагі на пытаннях грамадскага і прафесійнага прызнання вынікаў дзейнасці ў пэўнай меры дазваляе забяспечыць асобасную матывацыю [2, с. 142].

Адной з нефармальных мадэляў павышэння кваліфікацыі з’яўляецца дзейнасць (актыўнае сяброўства) у прафесійным музейным аб’яднанні (асацыяцыі). Дадзеную мадэль абіраюць музейныя работнікі, мэтай якіх з’яўляюцца высокія асабістыя дасягненні, нефармальныя зносіны з калегамі, аператыўнае атрыманне новай інфармацыі метадычнага, практычнага і прадметнага характару. Істотна, што гэтая інфармацыя звязана з канкрэтнай спецыфікай дзейнасці спецыяліста ў музеі.

Праца ў асацыяцыі дазваляе раскрыць і мабілізаваць асобасныя рэсурсы музейнага работніка, прааналізаваць і ўдасканаліць іх. Асноўнае адрозненне павышэння кваліфікацыі ў рамках асацыяцыі заключаецца ў тым, што ў музейных спецыялістаў з’яўляецца магчымасць стварыць каманды спецыялістаў (напрыклад, творчыя групы, часовыя творчыя калектывы), гатовыя садзейнічаць прафесійнаму росту калег, абмяркоўваць новыя ідэі і шляхі ўкаранення іх у музейнай практыцы, рэалізоўваць сумесныя праекты, распрацоўваць модульныя праграмы павышэння кваліфікацыі. У працэсе гэтай дзейнасці вызначаюцца лідары, якія дапамагаюць менш дасведчаным калегам рэалізаваць выпрацаваныя ідэі ў іх музейных установах.

Разгледзім асноўныя асаблівасці нефармальнай прафесійнай адукацыі на прыкладзе *Фонда аналіза і падтрымкі музейных*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*ініцыятыў*, *Інфармацыйнага музейнага цэнтра,* а таксама *Віртуальнага метадычнага кабінета па музейнай адукацыі, турызме і менеджменце* Асацыяцыі музеяў Беларусі.

Адной з найбольш актуальных і распаўсюджаных «галіновых» праблем з'яўляецца адсутнасць умоў для самаразвіцця музейнага жыцця, самаарганізацыі розных суб'ектаў музейнай дзейнасці. Для вырашэння гэтай праблемы пры Асацыяцыі музеяў Беларусі можа быць створаны *Фонд аналіза і падтрымкі музейных ініцыятыў*, які паспрыяе развіццю самадзейнасці, забяспечыць грамадскую запатрабаванасць творчага патэнцыялу музейных работнікаў. Дадзены праект можа быць рэалізаваны ў тры этапы, кожны з якіх вымагае рэалізацыі шэрагу мерапрыемстваў:

| Этапы праекта | Змест мерапрыемстваў |
|---|---|
| 1. Падрыхтоўка і правядзенне конкурса праектаў («Кірмаша музейных праектаў»), у якім могуць удзельнічаць суб'екты музейнай дзейнасці рознага падпарадкавання і форм уласнасці | 1. Фармаванне аргкамітэта конкурса і распрацоўка плана мерапрыемстваў.<br>2. Распрацоўка палажэння аб конкурсе.<br>3. Арганізацыя прэс-канферэнцыі.<br>4. Кансультацыі па складанні заявак на ўдзел у конкурсе.<br>5. Конкурс праектаў |
| 2. Стварэнне банка музейных ініцыятыў (праектаў) | 1. Збіранне заявак для ўдзелу ў аўкцыёне музейных праектаў.<br>2. Правядзенне аўкцыёна музейных праектаў |
| 3. Арганізацыя мэтавага Фонда музейных ініцыятыў (праектаў) | 1. Падрыхтоўка слуханняў па праблемах тэрытарыяльнай музейнай палітыкі.<br>2. Падбор ініцыятыўных груп у адпаведнасці з напрамкамі музейнай дзейнасці.<br>3. Распрацоўка статута мэтавага Фонда.<br>4. Правядзенне устаноўчага схода Фонда.<br>5. Рэгістрацыя Фонда |

Вырашэнню праблем арганізацыйна-кіраўнічага і фінансавага характару закліканы дапамагчы праект «*Інфармацыйны музейны цэнтр*». Актуальнасць стварэння Інфармацыйнага цэнтра па праблемах музейнай справы абумоўлена перш за ўсё

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

недахопам аператыўнай інфармацыі, неабходнай для карэкціроўкі прыярытэтных напрамкаў развіцця музейнай дзейнасці; адсутнасцю ў музейных работнікаў навыкаў працы з крыніцамі інфармацыі; слабай інфармаванасці насельніцтва аб мерапрыемствах і праграмах музейнага жыцця; нізкім узроўнем абмеркавання ў сродках масавай інфармацыі праблем музейнай палітыкі, музейнага жыцця краіны; несфармаванасцю інфармацыйнай базы аб музейным патэнцыяле гарадоў, рэгіёнаў, краіны; дэфіцытам бюджэтнага фінансавання музейнай сферы і адсутнасцю інфармацыі аб магчымых крыніцах пазабюджэтнага фінансавання праектаў і праграм (фонды, фірмы, банкі і г. д.), а таксама спосабах і тэхналогіях прыцягнення спонсараў, метадах стымулявання патранажу і дабрачыннасці.

Вырашэнне гэтых праблем прадугледжвае:

– адпаведнае інфармацыйнае забеспячэнне музейнай дзейнасці з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных тэхналогій (папярэдняе маркетынгавае даследаванне, ацэнка рэальнага попыту, канкурэнтаў і партнёраў);

– стварэнне Банка даных і распрацоўка механізмаў атрымання аператыўнай інфармацыі аб спецыяльных дабрачынных фондах, у т. л. замежных, якія субсідуюць музейныя праекты і праграмы;

– наяўнасць спецыяліста, які ўмее пісьменна аформіць заяўку на атрыманне сродкаў з пазабюджэтных крыніц, здольнага падтрымліваць эфектыўную сувязь з фондамі і валодаць методыкай распрацоўкі і прасоўвання заявак на субсідаванне розных праектаў з улікам профільнай спецыфікі і прыярытэтаў адпаведных фондаў.

Асноўныя напрамкі дзейнасці Інфармацыйнага музейнага цэнтра могуць быць наступныя:

– развіццё супрацоўніцтва музеяў са сродкамі масавай інфармацыі (праблемныя сустрэчы музейных работнікаў і журналістаў, спецыяльная праграма па сувязях са СМІ, арганізацыя серыі гарадскіх семінараў па выкарыстанні інфармацыйных і іншых сацыяльных магчымасцей музеяў і інш.);

– усталяванне рабочых кантактаў з рэспубліканскімі цэнтрамі інфармацыі ў галіне культуры і мастацтва і ўзаемаабмен інфармацыяй з імі;

– збіранне, назапашванне, апрацоўка і распаўсюджванне інфармацыі (у т. л. руска- і англамоўнай) аб музеях Беларусі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– пошук, вывучэнне, абагульненне, засваенне і ўкараненне новых інфармацыйных і сацыяльна-культурных тэхналогій;

– інфармацыйнае суправаджэнне рэалізацыі музейнай палітыкі ў краіне;

– фармаванне машыначытальных баз даных графічнай і выяўленчай інфармацыі па музейнай тэматыцы;

– інфармацыйнае абслугоўванне ў даведачным і інтэрактыўным рэжымах, з выкарыстаннем як уласных, так і партнёрскіх баз даных;

– арганізацыя выдавецкай дзейнасці, якая забяспечвае распаўсюджванне навукова-метадычнай інфармацыі, рэкламу, грамадскія сувязі;

– выпуск рэгулярных інфармацыйных бюлетэняў аб магчымых падзеях жыцця музеяў;

– аказанне паслуг музеям у галіне інфарматызацыі, выдавецкай дзейнасці, рэкламы;

– арганізацыя кансультацый і аказанне метадычнай дапамогі музеям па распрацоўцы, афармленні і прасоўванні заявак на ўдзел у конкурсах праграм і праектаў, фармаванні бізнес-плана і г. д.

Актуальным рашэннем праблемы інфармацыйнай і метадычнай падтрымкі музеяў Беларусі з’яўляецца стварэнне на партале museum.by *Віртуальнага метадычнага кабінета па музейнай адукацыі, турызме і менеджменце* [3]. Дадзены рэсурс дазволіць вырашыць комплекс важных задач:

– доступ да вынікаў новых даследаванняў, спецыялізаваных публікацый, метадычнай дапамогі, рэкамендацый у сферы музейнай справы;

– правядзенне анлайн-кансультацый і відэаканферэнцый як для спецыялістаў, так і для прадстаўнікоў СМІ, турыстычнага бізнесу або грамадскасці;

– змястоўная і метадычная падтрымка рэалізацыі музейна-педагагічных праграм ва ўстановах культуры, адукацыі, турызму і сем’ях;

– пошук партнёраў у музейнай сферы, магчымасць распрацоўкі і рэалізацыі межмузейных праектаў на нацыянальным і транснацыянальным узроўні;

– збор, аналіз, абагульненне і публікацыя найбольш каштоўных дасягненняў сусветнай музейнай практыцы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– стварэнне персанальных старонак спецыялістаў і/або музейных арганізацый з іх распрацоўкамі, аналітычнымі матэрыяламі і магчымасцю зваротнай сувязі.

Рэалізацыя гэтага праекта дасць магчымасць стварыць аснову для сістэматычнай прафесійнай камунікацыі, а таксама закладзе фундамент для распрацоўкі далейшых міжнародных праектаў.

З мэтай актывізацыі ролі музеяў у развіцці ўнутранага і міжнароднага культурнага турызму ў Рэспубліцы Беларусь неабходна:

– садзейнічаць развіццю міждысцыплінарных кантактаў музеяў са спецыялістамі з іншых сфер, уключаючы ахову культурнай спадчыны, турызму і адукацыі, з прыцягненнем прадстаўнікоў дзяржаўных і прыватных інстытуцый пазначаных сфер;

– стварыць працоўную групу па распрацоўцы канцэпцыі музейнага турызму ў Беларусі;

– распрацаваць сістэму культурна-пазнавальных турыстычных маршрутаў на базе нацыянальных і рэгіянальных музеяў;

– правесці серыю рэгіянальных трэнінгаў «Музеі і турызм» з прыцягненнем прадстаўнікоў музеяў рознага профілю, мэнэджараў у галіне турызму вышэйшага і сярэдняга звяна, радавых супрацоўнікаў. Разглядаць дадзеныя трэнінгі як інструмент аналізу і дыягностыкі сітуацыі ў музейна-турыстычнай сферы на рэгіянальным узроўні. Інфармацыя, атрыманая ад удзельнікаў трэнінгаў, павінна разглядацца як арыенцір для вызначэння прыярытэтаў, прыняцця рашэнняў падчас планавання раскрыцця турыстычнага патэнцыялу музеяў.

Такім чынам, нефармальная прафесійная адукацыя ў выглядзе рэалізацыі праектаў у межах музейнай асацыяцыі дазволіць паглыбіць веды і ўдасканаліць навыкі ў галіне праектнага менеджменту, прыцягнення дадатковых сродкаў для пашырэння музейнай дзейнасці, стварэння і адаптацыі асобных відаў праграм, накіраваных на розныя тыпы музейнай аўдыторыі, новых музейных інтэрпрэтацый, актывізацыі разнастайных каналаў музейнай камунікацыі, а таксама павышэння якасці музейнага сэрвіса, рэкламы і развіцця музейнай інфраструктуры ў цэлым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Кулемзин, А. М.* О формировании новой парадигмы подготовки музееведов / А. М. Кулемзин, Д. Д. Родионова // Вестн. Кемеровского гос. ун-та. – 2012. – № 2 (50). – С. 74–77.

2. *Родионова, Д. Д.* Современная профессиональная подготовка музейного специалиста / Д. Д. Родионова, А. А. Насонов // Профессиональное образование в России и за рубежом. – 2015. – № 3 (19). – С. 142–146.

3. Museum.by [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://museum.by/. – Дата доступу: 20.01.2020.

**С. В. Гутковская,**
*кандидат филологических наук,*
*доцент, профессор кафедры хореографии*

## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ КАФЕДРЫ ХОРЕОГРАФИИ В КОНТЕКСТЕ СОВРЕМЕННОЙ КОНЦЕПЦИИ РАЗВИТИЯ КУЛЬТУРЫ В БЕЛАРУСИ

Государственная программа «Культура Беларуси» на 2016–2020 гг., включающая четыре подпрограммы («Наследие», «Искусство и творчество», «Архивы Беларуси» и «Белорусы в мире») была утверждена Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 4 марта 2016 г. Среди ожидаемых результатов реализации государственной программы: поддержка приоритетных направлений развития национальной культуры; расширение доступа к культурным благам различным категориям населения; повышение качества и разнообразие культурных продуктов и услуг; обеспечение продвижения белорусской культуры за рубежом и другие*.

Стратегию действий по реализации программы «Культура Беларуси» в качестве ведущего замысла и конструктивного принципа определяет концепция развития культуры. Являясь результатом процесса стратегического планирования, она позволяет определить общее направление действий для достижения желаемого состояния в будущем как высшего учебного заведения в области культуры и искусства в целом, так и его

* Государственная программа «Культура Беларуси» на 2016–2020 гг. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://base.spinform.ru/show_doc.fwx?rgn=84909. – Дата доступа: 3.03. 2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ